**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2019 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках раённага рэкламнага тыдня “Бібліятэка ў пошуках ўласнага аблічча”</u>**

У бібліятэках ДУК прйшоў раённы рэкламны тыдзень “Бібліятэка ў пошуках ўласнага аблічча”, у рамках якога шэраг бібліятэк ДУК правялі Дні самакіравання “Я - сёння бібліятэкар”, “Библиотекарь – значит креативный”, “Чытач за бібліятэчнай кафедрай”, “Дублёр-шоу”.

**18 верасня**

У сваё прафесійнае свята работнікі Гарадзецкай публічнай бібліятэкі запрасілі калегаў, якія знаходзяцца на заслужаным адпачынку, на вечар-сустрэчу ў бібліятэцы «Бібліятэка прымае гасцей».

Бібліятэкары прынялі віншаванні ад былога старшыні Гарадзецкага сельвыканкама М. І. Здановіч. Шчодрым на музычныя падарункі быў народны калектыў Гарадзецкага сельскага клуба.

Госці мерапрыемства з дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі здзейснілі віртуальную экскурсію па бібліятэчных падзеях апошніх гадоў. Вядучыя запрасілі ўсіх прыняць удзел у бліц-апытанні і пазнаёміцца з кніжнымі выставамі, арганізаванымі ў рамках Тыдня бібліятэчнай рэкламы.

Гарадзецкі філіял, 18 чал.

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

**1 верасня**

У інфармацыйна-сервісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі для дзевяцікласнікаў СШ №№ 1 і 8 прайшоў першы ўрок «Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі».

Пры дапамозе мультымедыйнай прэзентацыі вучні пазнаёміліся з сучаснымі дасягненнямі краіны ў розных сферах жыцця, пачулі вершы беларускіх класікаў пра Беларусь. Самы актыўны ўдзельнік віктарыны аб Кобрыне атрымаў памятны падарунак. Напрыканцы мерапрыемства кобрынская паэтка Наталля Кандрашук прачытала юнакам свае вершы на беларускай мове.

ЦРБ, 80 чал.

**7 верасня**

Члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» цэнтральнай раённай бібліятэкі прынялі ўдзел у паэтычным марафоне «Любімая кропка на карце…» на адной з пляцовак падчас святкавання 1000-годдзя Брэста.

ЦРБ

**8 верасня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылася прэм'ера спектакля «Вся власть пенсионерам!», пастаўленага тэатрам-студыяй «Пирожок» у рамках праекта «Хобі-цэнтр 55+». Самадзейныя акцёры ў гумарыстычнай форме прадставілі інтарэсы сучасных пенсіянераў.

ЦРБ, 40 чал.

**15 верасня**

На паэтычнам нон-стопе «Кніжная імперыя» ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў літаратурнага конкурсу «Радуга созвучий», прымеркаванага да 80-годдзя Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Пераможцамі ў 5-ці намінацыях сталі Валянціна Літошык («Віншаванне бібліятэкару»), Зінаіда Навасад («Вершы пра бібліятэку»), Валянціна Пігас («Вершы пра кнігу»), Валянціна Саўчук («Апавяданні пра бібліятэку») і Таццяна Сацук («Апавяданні пра кнігу»). Ім былі ўручаны дыпломы і прызы ад спонсараў: ЗТАА «Лангхайнрых Канфекцыён Бел», Кобрынскай РА РГА «Белая Русь», «Школы прыгажосці» Вольгі Мацюхінай.

На мерапрыемстве кожны з прысутных канкурсантаў прачытаў адзін са сваіх твораў, дасланых на конкурс. Упрыгожаннем свята стала музычнае віншаванне ад вакальнага гурта «Фантазія» і выступленне самадзейнай тэатр-студыі «Піражок».

ЦРБ, 55 чал.

**22 верасня**

На базе інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра прайшла прэзентацыя кнігі Сяргея Палонскага «8 великих битв 1941 – 1945 гг.» падчас сустрэчы ўдзельнікаў расійскага аўтапрабегу, прысвечанага 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На сустрэчу прыйшлі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Васіль Дземідовіч, прадстаўнікі Кобрынскага райвыканкама і грамадскасці, педагогі і старшакласнікі д/с-СШ № 4 г. Кобрына.

Кіраўнік аўтапрабегу Мікалай Собалеў расказаў пра мэту патрыятычнай аўтавандроўкі ў Беларусь, пазнаёміў прысутных з іншымі падобнымі мерапрыемствамі, арганізаванымі Расійскім саюзам ветэранаў, і падзяліўся планамі на будучыню, а аўтар-выканаўца Валерый Мацвееў выступіў з канцэртнай праграмай «Пясок вайны».

ЦРБ, 51 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81